«по-местам-первой-мировой-войны-в-ивацевичском-районе»/. – Дата доступа: 27.02.2023.

7. Чупрасова, Д. С. Поездка на фронт: исторический туризм по следам Первой мировой войны (отечественный и европейский опыт) / Д. С. Чупрасова // История и археология : материалы VI Междунар. науч. конф., Казань, нояб. 2018 г. – Казань : Молодой ученый, 2018. – С. 18–21.

Герасимёнок В.Д., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лупашко И.Г.
кандидат культурологии, доцент

## КАНЦЭПЦЫЯ МУЗЕЯ-БУНКЕРА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У 1915 – 1916 гг. Пінскі раён стаў арэнай баявых супрацьстаянняў паміж нямецкім і рускім войскам. За час вядзення пазіцыйнай вайны з абодвух бакоў была пабудавана сотня ўмацавальных раёнаў і бункераў, выкапаны шматметровыя траншэі, а недалёка ад лініі фронту размяшчаліся артылерыйскія разлікі. Частка збудаванняў уцалела да нашых дзён. Адзін з такіх аб'ектаў размясціўся ў лесе каля в. Парэчча [1].

Больш за стагоддзе таму, недалёка ад самой вёскі, уздоўж лініі фронту, ішла чыгунка. Каля яе ў 1916 г. нямецкім кіраўніцтвам быў пабудаваны бункер, дзе размясціўся тылавы штаб камандавання, база правіянту і зброя для салдат. На дадзены момант гэта найбуйнейшы бункер часоў Першай сусветнай вайны, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У плане ен ўяўляе прастакутнік з прыбудаваным з франтальнага боку казематам. Мае два ўваходы па баках франтальнай сцяны. Унутры ўздоўж франтальнай і тылавой сцен ідуць калідоры, паміж якімі восем пакояў [5, с. 249].

Бункер, які меў вялікую ролю падчас Першай сусветнай вайны, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі фронт пайшоў яшчэ больш углыб былой

Расійскай імперыі, страціў свой першапачатковы сэнс. У далейшым ён больш не выкарыстоўваўся, і праз час быў канчаткова закінуты [3].

У наш час бункер прыцягвае да сябе ўсё большую колькасць беларускіх і замежных гісторыкаў і турыстаў, якія цікавяцца падзеямі аднаго з найбуйнейшых ваенных канфліктаў. У сувязі з гэтым, у 2021 г., на чарговую гадавіну заканчэння Першай сусветнай вайны, мясцовымі ўладамі ўстаноўлена інфармацыйная шыльда, дзе ўказана дата стварэння і тып абарончай пабудовы. Дзякуючы падтрымцы жыхароў в. Парэчча, удалося арганізаваць міні-экспазіцыю захаваных рэчаў, якія належалі салдатам абодвух бакоў канфлікту [1]. Таму лічым актуальным стварыць на базе бункера музей, канцэпцыю якога прапануем для разгляду.

Асноўная праца па стварэнню музея пачынаецца з фарміравання фондаў. Паколькі большую частку маёмасці бункера вывезлі разам з адступленнем нямецкія войскі, а астатняе было раскрадзена марадзёрамі ўжо пасля заканчэння вайны, фонды неабходна ствараць з нуля. Іх будучай асновай могуць стаць як прадметы, перададзеныя ваеннымі і краязнаўчымі музеямі з усёй Беларусі, так і тыя, што атрымае музей ад мясцовых жыхароў і закупіць у калецыянераў і на аўкцыёнах. Зыходзячы з геаграфічнага становішча, музей-бункер мэтазгодна зрабіць філіялам гісторыка-краязнаўчага музея ў Івацэвічах, што істотна пашырыць пачатковы памер фондаў і спросціць працу з імі.

Далей неабходна распрацаваць план рэканструкцыі ўнутранага і знешняга ўбрання. За стагоддзе яно прыйшло ў незадавальняючы стан, але яго можна аднавіць, пры гэтым захаваўшы гістарычны выгляд будынка. Усе сцены і падлога зроблены з бетону, таму гэта істотна паскорыць працэс рэканструкцыі. Бункер неабходна ачысціць ад травы і бруду, захоўваючы пры гэтым першапачатковы выгляд, не дадаючы новых элементаў і вяртаючы зніклыя.

Наступны этап – праца над канцэпцыяй экспазіцыі. За аснову можна ўзяць бункер камандавання авіяцыяй у Шчучыне часоў Халоднай вайны,

музей-вёску Заброддзе ў Мінскай вобласці і музей-бункер У. Чэрчыля ў Лондане.

Пры ўваходзе ў будучы музей нас сустракае круглы пакой. З прычыны яго малога памеру, давядзецца абмежавацца невялікімі інсталяцыямі на тэму Першай сусветнай вайны (паставіць на ўваходзе фігуры-інсталяцыі рускага ці/і нямецкага салдата) і разлікова-касавым цэнтрам. Пасля набыцця білета тут можна пачаць агляд экспазіцыі, а перад сыходам набыць сувеніры з сімволікай музея альбо паменшанымі копіямі прадстаўленых у ім экспанатаў [5, с. 275-276].

Непасрэдна экспазіцыя будзе размешчана ў васьмі памяшканнях. Чатыры з іх варта прысвяціць падзеям Першай сусветнай вайны на беларускіх землях і зрабіць пастаяннай экспазіцыяй: ад прыходу нямецкіх войскаў на Беларусь у жніўні 1915 г., іх замацавання ў сучасных заходніх абласцях у 1916 г., прарыву лініі фронту у 1917 г. падчас кіравання Часовага ўрада, і да паражэння і адыходу салдат Германскай імперыі з тэрыторыі Беларусі ў лістападзе 1918 г. [1, с. 41-42].

Астатнія памяшканні прапануем выкарыстоўваць для размяшчэння інтэрактыўна-адукацыйнай зоны. Напрыклад, пятае памяшканне можна адаптаваць пад невялікую “салдацкую” сталовую, якая будзе даступна за дадатковую плату. Рацыён будзе максімальна набліжаны да салдацкага таго часу, а наведвальнікаў пазнаёмяць з неабходным памерам дзённай пайкі.

У шостым пакоі можна размясціць рэканструкцыю кабінета нямецкага камандавання. Кожны наведвальнік зможа падняць тэлефонную трубку і пачуць запісаныя падчас вайны перамовы, а таксама пазнаёміцца з мапай, якую выкарыстоўвалі немцы падчас планавання аперацый і назіраннем за сітуацыяй на фронце. Дапаўняць экспазіцыю будуць фігуры-інсталяцыі салдат і камандзіраў ва ўласцівай ім ваеннай форме.

Наступны пакой прапануем выкарыстоўваць як міні-кіназалу для прагляду фільмаў пра Першую сусветную вайну, яе вядомыя падзеі, а таксама герояў, якія абаранялі беларускую зямлю. Для падтрымання разнастайнасці,

на змест фільмаў будзе ўплываць тэматыка часовых экспазіцый. Пасля адкрыцця музея-бункера для наведвальнікаў першы час будзе прапанаваны прагляд фільма аб гісторыі стварэння першага падобнага праекта ў Беларусі і аб планах па яго далейшаму развіццю.

Апошні пакой дазволіць кожнаму наведвальніку “стаць салдатам” Першай сусветнай вайны. Напрыклад, можна будзе прымерыць на сябе салдацкую форму, патрымаць муляжы вядомых узораў узбраення і асабіста паўдзельнічаць у зборы неабходнага набору рыштунку байца.

Пасля завяршэння працы над экспазіцыяй пачынаецца распрацоўка экскурсіі. З дапамогай экскурсавода і ўзаемадзеяння з інтэрактыўнымі элементамі наведвальнікі даведаюцца пра падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, вядучыя бакі канфлікту і іх прадстаўнікоў, а таксама змогуць прасачыць, як мянялася заходняя лінія фронту на працягу чатырох гадоў. Важную ролю ў праграме зоймуць Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі, а таксама дзейнасць манарха Мікалая ІІ, Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання ў Магілёве, Часовага ўрада і Саветаў [5, с. 277-278].

Для паўнавартаснага функцыянавання аб’екта неабходна вырашыць шэраг адміністрацыйна-гаспадарчых пытанняў: правесці ў бункер ваду, святло і ацяпленне. Дзякуючы блізкаму знаходжанню аб'екта да р. Ясельда, пытанне з водазабеспячэннем можна вырашыць адносна проста. Але для функцыянавання электразабеспячэння і ацяплення можа запатрабавацца наяўнасць генератара [3].

Штат музея-бункера будзе невялікім: захавальнік фондаў, экскурсавод з веданнем замежных моў, уключаючы англійскую і нямецкую, IT-спецыяліст для падтрымання працы інтэрактыўных элементаў экспазіцыі, а таксама сайта музея, наглядчык, касір і прыбіральшчык. Бухгалтарам зможа стаць супрацоўнік галаўнога музея, альбо яго задачы можна аддаць на аўтсорсінг.

Музей-бункер, у першую чаргу, – гэта праект, які накіраваны на захаванне гістарычнай памяці, таму камерцыйная выгада мала магчымая. Ён зможа існаваць пераважна за кошт сродкаў мясцовых органаў улады, а таксама

прыватных асоб. За некалькі месяцаў да адкрыцця трэба правесці рэкламную кампанію ў айчынных і замежных СМІ. Важную ролю ў падтрымцы праекта музея змогуць аказаць беларускія гісторыкі і археолагі, у тым ліку арганізацыйную і кансультатыўную [5, с. 277].

У якасці прадзвіжэння музея як турыстычнага аб'екта асноўны акцэнт, на наш погляд, трэба зрабіць на ўнутраных турыстах, а таксама турыстах з краін ЕС і СНД. Геаграфічна бункер размешчаны адносна зручна і да яго можна даехаць самастойна на аўтамабілі ці наведаць у межах аўтобуснай экскурсіі.

Час працы бункера трэба разлічыць зыходзячы са статыстыкі наведваемасці. Найбольш папулярнымі сезонамі стануць лета і восень, а зімой і вясной музей будзе мала запатрабаваны, таму адкрыццё ў гэты перыяд мэтазгодна толькі на памятныя даты, напрыклад: Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. і Брэсцкі мір 1918 г.

Музей-бункер будзе размяшчацца на вуліцы Паркавай у вёсцы Парэчча. Прапануюцца наступныя часы працы: панядзелак – пятніца з 10:00 да 18:00, у суботу і нядзелю з 10:00 да 20:00. Прадугледжаны звычайны і ільготны білет, а таксама бясплатны ўваход для дзяцей да 12 гадоў. Мінімальны памер групы для правядзення экскурсіі – 4 чалавекі [1, с. 10-11].

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. В Пинском районе в годовщину Первой мировой войны обозначат связанные с ней объекты [Электронный ресурс] // Новости Беларуси / БелТА. – Режим доступа: https://www.belta.by/regions/view/v-pinskom-rajone-v-godovschinu-pervoj-mirovoj-vojny-oboznachat-svjazannye-s-nej-objekty-468925-2021/. – Дата доступа: 20.02.2023.

2. Морозов, Д. В., Скворчевский, Д. В. Использование национальных мест памяти в развитии военно-исторического туризма в Республике Беларусь : сборник материалов / Д. В. Морозов, Д. В. Скворчевский. – Минск : Колорград, 2022. – 343 с.

3. Немецкий бункер времен Первой мировой в Поречье [Электронный ресурс] // Пинск / Культурный туризм. – Режим доступа: https://culttourism.ru/belarus/brestskaya/pinsk/nemetskiy_bunker_vremen_pervoy_mirovoy_v_poreche.html. – Дата доступа: 20.02.2023.

4. Сакута, Е. А. Современное состояние развития военно-исторического туризма в Республике Беларусь / Е. А. Сакута // Устойчивое развитие: региональные аспекты : сборник материалов XII Междунар. научн.-практ. конф. молод. уч., Брест, 23-24 апр. 2020 г. / Брестск. гос. ун-т ; редкол.: М. А. Богдасаров [и др.]. – Брест : БрГУ, 2020. – С. 275–278.

5. Хвагина, Т. А. Разработка туристических маршрутов по местам Первой мировой войны на Полесье / Т. А. Хвагина // Военно-историческое наследие Первой мировой войны в Республике Беларусь и Российской Федерации: проблемы изучения, сохранения и использования / Гродненск. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Нечухрин [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2016. – С. 243–251.

Германович У.А., студент 401 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Смоликова Т.М.,
кандидат культурологии, доцент

## ИНТЕРНЕТ-РЕКЛАМА КАК ЭФФЕКТИВНЫЙ ИНСТРУМЕНТ ПРОДВИЖЕНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧРЕЖДЕНИЯ КУЛЬТУРЫ

Интернет является эффективным средством позиционирования деятельности учреждений культуры, не имеющим территориальных ограничений и временных затрат на коммуникацию с потребителями, при этом стоимость доступа к информации не зависит от удаленности от нее, в отличие от традиционных средств, где эта зависимость прямо пропорциональна. Креативные походы и техники создания интернет-рекламы позволяют